# #МАЙСТАР-КЛАС

***Кафедра «Архітэктуры і дызайна» Полацкага дзяржуніверсітэта распачала правядзенне бясплатных майстар-класаў для ўсіх жадаючых школьнікаў. Мэта – пазнаёміць юных навапалачан са спецыяльнасцямі кафедры.***



*Майстар-клас праводзіць А.Піскун*

Першую сустрэчу з моладдзю правяла старэйшы выкладчык кафедры Вераніка Васільева. Тэматыка занятку была прысвечана гораду, у якім хочацца жыць, – «Гораду мары». Будучыя творцы працавалі з колерам, здзяйсняючы падарожжа ў фантазійныя спалучэнні і разважанні аб арганізацыі прасторы і яго напаўненні.

Другі майстар-клас – «Займальны накід» – са старэйшым выкладчыкам кафедры Андрэем Піскуном быў накіраваны на працу з графікай і пластычнасцю ліній, тонам, кампаноўкай і фактурай, матэрыяльнасцю ў маляванні з натуры.

Не абышлося і без віртуальнай рэальнасці. Вывучэнне асноў праграмнага забеспячэння для інфармацыйнага мадэлявання будынкаў і праектавання архітэктурных элементаў пачалося з праграмнага комплексу Revit з асістэнтам кафедры Уладзіславам Хватынцом. Госці майстар-класаў стварылі інтэр'ер пакоя, у якім бы яны з задавальненнем жылі.

Акунуцца ў творчы свет прафесіі архітэктара, дызайнера, захапіцца, вывучыць і стварыць новыя для сябе формы, канструкцыі ў наступны раз можна будзе падчас зімовых канікул. Падрабязная інфармацыя – на сайце ўніверсітэта альбо ў групе «УКантакце» «Навапалацкая архітэктурная школа».